УДК 808.26 – 331

**Г.К. Семянькова**

# Прозвішчныя тыпы Віцебшчыны: паміж усходам і захадам

Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны анамастамі да гэтага часу не вывучаліся. Таму мэтай артыкула з'яўляецца аналіз структуры прозвішчаў жыхароў Глыбоцкага і Лёзненскага раёнаў, выяўленне найбольш прадуктыўных прозвішчных тыпаў, высвятленне пытання, як уплывае месца жыхарства на форму іменавання.

Выбар для параўнальнага аналізу менавіта гэтых раёнаў невыпадковы: у выніку гістарычных падзей мінулага антрапанімная сістэма названых тэрыторый спазнала розныя ўплывы: Глыбоччына ў большай ступені – заходні, польскі, Лёзненшчына – усходні, рускі.

Матэрыялам для даследавання паслужыла картатэка прозвішчаў, сабраная на аснове «Пагаспадарчых кніг...» 40-х гг. XX ст., што знаходзяцца ў фондах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і яго занальных архіваў.

Як сведчыць матэрыял, прозвішчы, утвораныя пры дапамозе прозвішчаўтваральных суфіксаў, складаюць асноўную частку ў Лёзненскім і ў Глыбоцкім раёнах. Такія прозвішчы М.В. Бірыла адносіць да другасных [1] і супрацьпастаўляе ім так званыя першасныя, у якіх паўтараюцца структурныя тыпы апелятываў або якія супадаюць з апелятывамі і імёнамі.

Прозвішчы, утвораныя пры дапамозе суфікса **–оў/-аў/-еў**, зафіксаваны ў абодвух раёнах. Аднак, калі ў Лёзненскім раёне гэты тып з'яўляецца самым прадуктыўным (табліца) і на яго долю прыпадае 45,6% ад усіх зафіксаваных адзінак, то ў Глыбоцкім раёне такіх прозвішчаў толькі 12,97% ад агульнай колькасці.

Цікава адзначыць, што прадуктыўнасць адзначанага тыпу ў 60-я гг. у сярэднім па Беларусі складала 24% [2] , у Расіі – 50,36% [2, с.16]. Як бачна, частотнасць прозвішчаў на **–оў/-аў/-еў** у Лёзненскім раёне значна перавышае сярэдні паказчык па Беларусі і толькі крыху ўступае сярэдняму ўзроўню іх у рускай мове. Тлумачыцца гэта, верагодна, тым, што тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай уваходзіла ў склад Расіі, у выніку чаго большасць насельніцтва далучанай часткі Беларусі пры афармленні розных дакументаў была запісана з прозвішчамі на **–оў /–еў** [2, с. 41, 44].

Вядома, што прозвішчы на **–оў/-аў/-еў** носяць патранімічны характар, адказваюць на пытанне «чый сын?» і звычайна ўтвараюцца ад імёнаў і мянушак бацькі. Наш матэрыял паказвае, што прозвішчы, матываваныя мянушкамі, пераважаюць над утварэннямі ад хрысціянскіх імёнаў у Лёзненскім і ў Глыбоцкім раёнах. Гэта яшчэ раз пацвярджае думку, выказаную Г.М. Мезенкай, што асноўным кірункам фарміравання сямейнага іменавання ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі ў пачатку XX ст. было усталяванне прозвішчаў з мянушак.

З сабранага матэрыялу вынікае, што прозвішчы на **–оў/-аў/-еў** нярэдка матывуюцца мянушкамі, якія а) утрымліваюць характарыстыку асобы па роду дзейнасці: *Канавалаў* <Канавал; *Трубачоў* < Трубач; *Агароднікаў* < Агароднік; *Красельшчыкаў* < Красельшчык; *Пруднікаў* < Пруднік; *Серабракоў* < Серабрак; *Конюхаў* < Конюх; *Дойлідаў* < Дойлід; б) падкрэсліваюць пэўныя рысы характару, фізічныя і псіхічныя асаблівасці чалавека: *Трудалюбаў* < Трудалюб; *Красаўцаў* < Красавец; *Кашчэеў* < Кашчэй; *Марудаў* < Маруд; *Леўшуноў* < Ляўшун; *Сляпцоў* < Сляпец; *Умнікаў* < Умнік; *Рабаў* < Рабы; *Дабракоў* < Дабрак; *Глушакоў* < Глушак; в) паходзяць ад назваў жывёл і птушак: *Кочатаў* < Кочат; *Петушкоў* < Петушок; *Кулікоў* < Кулік; *Вераб'ёў* і *Вараб'ёў* < Варабей; *Кротаў* < Крот; *Барсукоў* < Барсук; г) выступаюць як назвы асоб па нацыянальнай прыналежнасці або месцу жыхарства: *Чаркасаў* < чаркас; *Ліцвінаў* < ліцвін; *Палякоў* < паляк; *Сербаў* < серб; *Французаў* < француз; *Хахлоў* < хахол (у дачыненні да гэтага прозвішча магчыма, на наш погляд, яшчэ адна матывацыя – ад хахол, «чуб»); *Шведаў* < швед; *Цыганкоў* < цыганок; *Маскалёў* < маскаль.

Заўважана, што яшчэ адным даволі прадуктыўным сярод прозвішчаў жыхароў Лёзненскага раёна з'яўляецца тып на **-ін/-ын** (12,03% ад агульнай колькасці прозвішчаў у гэтым раёне). На Глыбоччыне адзначаны тып складаюць толькі 2,67% адзінак. Пры гэтым вынікі нашага даследавання прыметна разыходзяцца з дадзенымі М.В. Бірылы, які сцвярджаў, што па ўсёй тэрыторыі Віцебскай вобласці прадуктыўнасць прозвішчаў на **-ін/-ын** складае 1-5% [2, с.43]. Магчыма, звязана гэта з тым, што наш матэрыял уключае

прозвішчы 40-х гг., а дадзеныя М.В. Бірылы датуюцца 60-мі гадамі і значыць ёсць усе падставы дапусціць, што колькасць прозвішчаў аналізуемага тыпу на Лёзненшчыне ў 60-я гг. зменшылася ў параўнанні з 40-мі гадамі.

Матэрыял паказвае, што значная частка прозвішчаў на **–ін/-ын** утварылася ад мужчынскіх імёнаў на –а (28,49% ад усіх адзінак на –ін/-ын). Сярод іх наступныя: *Карпушын* < Карпуха < Карп; *Левін* < Лёва < Леў; *Аніскін* < Аніска < Анісім; *Андрухін* < Андруха < Андрэй; *Міхалачкін* < Міхалачка < Міхалка < Міхал < Міхаіл; *Сяргушкін* < Сяргушка < Сяргей; *Валодзін* < Валодзя < Уладзімір; *Сідоркін* < Сідорка < Сідар; *Емельянкін* < Емельянка < Емельян.

Прозвішчы, якія ўтварыліся ад мянушак апелятыўнага паходжання на –а, таксама займаюць значнае месца ў нашым матэрыяле. Прывядзём некалькі прыкладаў: *Карчагін* < Карчага (карчага, «пень, вывернуты з карэннем», «тое, што і амфара», «гляк для мазі» ); *Латушкін* < Латушка (латушка абл. «невялікая гліняная пасудзіна, міска з загнутымі ўнутр краямі», «жаночая світка»); *Старыцын* < Старыца (старыца «старое, перасохлае рэчышча»); *Шлягін* < Шляга (шляга «прылада, ударамі якой трамбуюць ці ўшчыльняюць глебу, пясок, каменне і пад., а таксама выраўноўваюць паверхню»); *Курапаткін; Барадаўкін; Бутылкін; Бумашкін* і інш.

Вельмі рэдка сустракаюцца прозвішчы на **–ін/-ын**, утвораныя ад жаночых імёнаў. У абодвух раёнах такія антрапонімы адзінкавыя (*Стэфкін; Сцешкін; Марусін*).

Даволі частотнымі ў Лёзненскім раёне з'яўляюцца прозвішчы на **–енка/-энка/-анка** (15,33% ад усіх прозвішчаў жыхароў Лёзненскага раёна). Сярод жа прозвішчаў жыхароў Глыбоцкага раёна адзначаны тып малапрадуктыўны (1,07%). Такім чынам, вынікі нашага даследавання пацвярджаюць вывады М.В. Бірылы, які пісаў, што «на Беларусі асноўны масіў бытавання прозвішчаў з суфіксам **-енка** знаходзіцца ва ўсходняй частцы рэспублікі – на ўсход ад лініі Бягомль – Барысаў – Чэрвень – Слуцк – Лунінец» [2,с.50].

У зафіксаваных намі прозвішчах шмат такіх, што матываваны рознымі формамі ўласных імёнаў (Лёзненскі р-н – 43%, Глыбоцкі – 75% ад усіх утварэнняў на **–енка**): а) поўнымі формамі мужчынскіх хрысціянскіх імёнаў (*Цімафеенка* < Цімафей; *Філімоненка* < Філімон; *Федарэнка* < Фёдар; *Тарасенка* < Тарас; *Сцепаненка* < Сцяпан; *Сіманенка* < Сімон; *Назарэнка* < Назар; *Купрыенка* < Купрыян; *Міхеенка* < Міхей; *Дарафеенка, Драфеенка* < Дарафей і інш.); б) усечанымі размоўнымі формамі мужчынскіх хрысціянскіх імёнаў (*Панкраценка* < Панкрат < Панкратий; *Ісачанка* < Ісак < Исаакий; *Патапенка* < Патап < Потапий; *Каліненка* < Каліна < Калинник; *Ігнаценка* < Ігнат < Игнатий і інш.); в) бытавымі памяншальна-ласкальнымі формамі мужчынскіх імёнаў (*Маісейчанка* < Маісейка; *Мінчанка* < Мінька; *Міхалчанка* < Міхалка; *Янчанка* < Янка; *Юрчанка* < Юрка; *Цімошчанка* < Цімошка; *Цярэшчанка* < Цярэшка; *Саўчанка* < Саўка; *Даньчанка, Данчанка* < Данька і інш. ); г) рэгіянальнымі варыянтамі імёнаў (Васіпенка < Восіп < Иосиф; *Майсейчанка* < Майсейка < Моисей; *Маясеенка* < Маясей < Моисей); д) бытавымі формамі жаночых імёнаў (*Любчанка* < Любка; *Марусенка* < Маруся).

Прыкладна палова з сабраных у Лёзненскім раёне прозвішчаў на **–енка/-энка/-анка** ўтворана ад мянушак, якія характарызуюць чалавека па роду дзейнасці (*Каваленка, Пастушэнка, Сталярэнка, Швайчэнка, Салдаценка*), па фізічных прыкметах і недахопах (*Сухаручанка* < Сухарукі; *Касалапенка* < Ка-салапы; *Лысенка* < Лысы; *Каротчанка* < Кароткі; *Крывенка* < Крывы; *Картавенка* < Картавы ) і інш.

Даволі шматлікай па колькасці з'яўляецца група прозвішчаў на **–скі/-цкі** як у Лёзненскім (9,57%), так і ў Глыбоцкім (18,85%) раёнах. Большасць з іх з'яўляецца адтапанімнымі ўтварэннямі, бо паходзіць ад геаграфічных і

тапаграфічных назваў: *Іваноўскі* < Іванова; *Вайцяхоўскі* < Вайцяхі; *Храпавіцкі* < Храпавічы; *Раманоўскі* < Раманоўка; *Рагоўскі* < Рагі; *Маліноўскі* < Малінова; *Кавалеўскі* < Кавалеўцы і інш.

У некаторых выпадках цяжка вызначыць, ад якога тапоніма ўтворана прозвішча. Вядома, што пасля асноў, якія заканчваюцца збегам зычных, перад суфіксам **-ск-** з'яўляецца інтэрфікс -оў-/-аў-/-еў-, напрыклад: Барк-і + -ск- > Баркоўскі. Таму прозвішчы тыпу *Янкоўскі, Баркоўскі* могуць разглядацца як утвораныя і ад тапонімаў Янков-а, Барков-а пры дапамозе фарманта **–скі**, і ад тапонімаў Янк-і, Барк-і пры дапамозе фарманта **–оўскі**, тым больш, што ў «Слоўніку назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці» Я.Н. Рапановіча [3] знаходзім абодва тыпы падобных назваў, якія маглі стаць утваральнымі асновамі для названых прозвішчаў.

Сустракаюцца выпадкі, калі нельга даць адназначны адказ на пытанне, які іменна з магчымых тапонімаў пакладзены ў аснову прозвішчаў з-за таго, што існуюць а) розныя родавыя формы тапонімаў (*Хмяльніцкі* < Хмяльнік, Хмяльніца), б) аднакаранёвыя тапонімы, асновы якіх адрозніваюцца суфіксамі (*Старынскі* < Старынка, Старына; *Прудаўскі* < Прудавое, Прудаў'ё; *Марцінаўскі* < Марцінава, Марцінаўка; *Лісоўскі* < Лісоўка, Лісоўцы), в) рознакаранёвыя з падобным гукавым складам (*Баранскі* < Барань, Бараны), якія з аднолькавай ступенню верагоднасці маглі быць выкарыстанымі пры ўтварэнні прозвішчаў.

Некаторыя прозвішчы на **–скі/-цкі** маюць выразныя фанетычныя рысы, якія даказваюць іх паходжанне з польскай мовы: *Белабжэцкі* ( параўн.: brzeg – бел. бераг ), *Загурскі* ( параўн.: góra – бел. гара ), *Бразоўскі* ( параўн.: brzoza – бел. бяроза ).

Вядома, што прозвішчы на **–овіч/-евіч, -іч/-ыч** па паходжанні з'яўляюцца імем па бацьку. Па нашых дадзеных, у Лёзненскім раёне яны складаюць 3,75%, у Глыбоцкім жа гэты тып займае другое (пасля прозвішчаў на **–скі/-цкі**) месца па прадуктыўнасці (14,97%). Такія вынікі яшчэ раз пацвярджаюць думку, што «колькасць прозвішчаў на **-овіч/-евіч, -іч/-ыц** памяншаецца ў напрамку на ўсход» [1; с.31], але разыходзіцца з дадзенымі лінгвістычных карт, якія паказваюць, што ў Лёзненскім раёне прозвішчы названага тыпу складаюць больш за 10%, а ў Глыбоцкім – больш, чым 40% [1; с.32].

Заўважана, што большая частка прозвішчаў гэтага тыпу ўтворана ад розных форм хрысціянскіх імёнаў (63,77%): *Паўловіч, Грышкевіч, Грыгаровіч, Гаўрыловіч, Дзімідовіч, Аніскевіч, Карповіч* і інш.

Прозвішчы, утвораныя пры дапамозе суфікса **–іч/-ыц**, вельмі рэдкія ў Глыбоцкім раёне (*Зеваліч, Кузьміч, Хоміч, Бародзіч*) і зусім не зафіксаваны ў Лёзненскім раёне.

Прозвішчы на **–онак/-енак** займаюць трэцяе месца ў Глыбоцкім раёне (7,62%), а ў Лёзненскім сустракаюцца спарадычна (0,58%). Даследчыкі адзначаюць, што такія антрапонімы распаўсюджаны на тых тэрыторыях, дзе пры дапамозе названага суфікса ўтвараюцца назвы маладых істот тыпу парасёнак, жарабёнак [2]. Відавочна, што гэты суфікс у прозвішчах мае патранімічнае значэнне, пры яго дапамозе ўтвораны прозвішчы ад уласных імёнаў (*Піліпёнак, Пракапёнак, Прахаронак, Трахімёнак, Тарасёнак, Якубёнак, Майсяёнак, Захарчонак* і інш.) і ад мянушак апелятыўнага паходжання (*Казачонак, Крывёнак, Брылёнак, Глушонак, Галубёнак, Карабёнак* і інш.).

Прозвішчы, утвораныя пры дапамозе суфіксаў **–ук/-юк, -чук**, складаюць у Глыбоцкім раёне 1,34%, а ў Лёзненскім – 0,32% ад агульнай колькасці прозвішчаў. Наш матэрыял уключае наступныя ўтварэнні на **–ук/-юк, -чук**: *Станіслаўчук, Алексяйчук, Раманчук, Клішчук, Татарчук, Паламарчук* < Паламар ( паламар – рэг. «панамар» ), *Шаўструк* і інш.

Прадуктыўнасць прозвішчаў на **–ік/-ык, -чык** у Лёзненскім раёне складае 0,25%, у Глыбоцкім – 2,27%. Як бачым, яна значна меншая, чым у сярэднім па Беларусі (5%) [1,с.40]. Намі зафіксаваны антрапонімы, утвораныя ад мужчынскіх імёнаў (*Андрэйчык, Гаўрыльчык, Савік, Карпік*), ад назоўнікаў жаночага роду на –а (*Іўчык, Ліпчык*), ад прыметнікаў (*Новік, Багацік*), ад назоўнікаў мужчынскага роду з нулявой флексіяй (*Белахвосцік, Шкецік*).

Прозвішчы на **–ец/-эц, –авец, -анец** складаюць невялікую па колькасці групу ў абодвух раёнах (табліца). Частка з іх утворана ад геаграфічных назваў (*Юркавец* < Юркава, Юркаўшчына; *Баркавец* < Баркова, Баркі), астатнія – ад антрапонімаў.

Заўважана, што прозвішчы лексіка-семантычнага ўтварэння даволі распаўсюджаны ў Глыбоцкім раёне, асабліва тыя, што паходзяць ад апелятываў-назоўнікаў: *Самалёт, Астаноўка, Чарвяк, Пятух, Зязюля, Лісіца, Кот, Казел, Заяц, Дубіна, Рубашка, Рамашка, Канапелька, Кісель, Траўка, Ляпёшка, Вятр, Брахун, Лабун* і інш. Значна менш у гэтым раёне ўтварэнняў ад уласных імёнаў (*Лазар, Мішута, Панцялей, Сапрон, Хрол, Усціян, Грынь*) і ад апелятываў-прыметнікаў (*Лабаты, Доўгі, Кіслы, Лысы, Шчасны, Чорны, Храмы, Сухі, Гладкі, Салодкі*).

У Лёзненскім раёне прадуктыўнасць кожнай з пералічаных вышэй груп не перавышае 1% (табліца).

Адзінкавымі ў абодвух раёнах з'яўляюцца прозвішчы, па тэрміналогіі М.В. Бірылы, сінтаксічна-марфалагічнага ўтварэння тыпу *Сырапятка, Беладзед, Скарахход, Крываручка*.

Такім чынам, з усяго сказанага вышэй вынікае, што ў Лёзненскім і ў Глыбоцкім раёнах дамінуюць розныя прозвішчныя тыпы.

Табліца

**Прадуктыўнасць прозвішчаў жыхароў Лёзненскага і Глыбоцкага раёнаў** (40-я гг.XX ст. )

<table>
<tr><td rowspan="2">Тыпы<br>і падтыпы</td><td colspan="3">Лёзненскі р-н</td><td colspan="2">Глыбоцкі р-н</td></tr>
<tr><td colspan="2">Колькасць фіксацый</td><td>%</td><td>Колькасць фіксацый</td><td>%</td></tr>
<tr><td>І.Прозвішчы суфіксальнага ўтварэння</td><td colspan="2">1358</td><td>87,84</td><td>476</td><td>63,64</td></tr>
<tr><td>-оў/-еў/-аў</td><td colspan="2">705</td><td>45,6</td><td>97</td><td>12,97</td></tr>
<tr><td>-ін/-ын</td><td colspan="2">186</td><td>12,03</td><td>20</td><td>2,67</td></tr>
<tr><td>-енка/-энка/-анка</td><td colspan="2">237</td><td>15,33</td><td>9</td><td>1,07</td></tr>
<tr><td>-скі/-цкі</td><td colspan="2">148</td><td>9,57</td><td>141</td><td>18,85</td></tr>
<tr><td>-овіч/-евіч, -авіч</td><td colspan="2">58</td><td>3,75</td><td>112</td><td>14,97</td></tr>
<tr><td>-іч/-ыч/-ыц</td><td colspan="2">--</td><td>--</td><td>8</td><td>1,07</td></tr>
<tr><td>-енак/-онак</td><td colspan="2">9</td><td>0,58</td><td>57</td><td>7,62</td></tr>
<tr><td>-ік/-ык, -чык</td><td colspan="2">8</td><td>0,52</td><td>17</td><td>2,27</td></tr>
<tr><td>-ук/-юк, -чук</td><td colspan="2">5</td><td>0,32</td><td>10</td><td>1,34</td></tr>
<tr><td>-ец/-эц,-авец,-анец</td><td colspan="2">2</td><td>0,13</td><td>5</td><td>0,67</td></tr>
<tr><td rowspan="3">ІІ.Прозвішчы лексіка-семантычнага ўтварэння</td><td>Ул.ас.імя</td><td>14</td><td>0,91</td><td>15</td><td>2,0</td></tr>
<tr><td>Апелятыў-назоўнік</td><td>15</td><td>0,97</td><td>90</td><td>12,03</td></tr>
<tr><td>Апелятыў-прыметнік</td><td>12</td><td>0,78</td><td>12</td><td>1,6</td></tr>
<tr><td>ІІІ.Прозвішчы сінтаксічна-марфалагічнага ўтварэння</td><td colspan="2">3</td><td>0,19</td><td>3</td><td>0,4</td></tr>
<tr><td>Разам</td><td colspan="2">1402</td><td>90,69</td><td>596</td><td>79,68</td></tr>
</table>

На тэрыторыі Лёзненскага раёна вядучае месца належыць агульнаславянскаму прозвішчнаму тыпу на **–оў/-еў/-аў**. Значна менш антрапонімаў на **–енка/-энка/-анка, –ін/-ын** і **–скі/-цкі**, хоць і яны даволі распаўсюджаны. Такім чынам, блізкасць (а ў часы фарміравання беларускіх прозвішчаў агульнасць ) беларускай і рускай тэрыторый абумовілі тое, што дамінуючымі на ўсходзе Віцебшчыны сталі тыпы, якія з'яўляюцца найбольш прадуктыўнымі і ў Расіі.

На тэрыторыі Глыбоцкага раёна найбольш значнае па колькасці месца займае агульнаславянскі тып на **–скі/-цкі**, крыху менш антрапонімаў на **–овіч/-евіч/-авіч** і на **–оў/-еў/-аў**. Неабходна адзначыць і той факт, што на гэтай тэрыторыі распаўсюджаны першасныя прозвішчы, у аснове якіх – апелятыў-назоўнік. Відавочна, што на захадзе Віцебскай вобласці адчуваецца значны ўплыў польскіх антрапанімных традыцый, паводле якіх большая частка прозвішчаў утворана ад тапонімаў пры дапамозе суфіксаў **–скі/-цкі**.

Малапрадуктыўныя ў абодвух раёнах прозвішчныя тыпы на **–ец/-эц, –авец, –анец**, а таксама на **–іч/-ыч/-ыц**. Адзінкавымі з'яўляюцца таксама антрапонімы тыпу *Беладзед, Скараход, Крываруха*.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Бірыла М.В.*** Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў (рускай, украінскай, польскай). Мн., 1963. С. 3.
2. ***Бірыла М.В.*** Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў. Мн., 1988. С. 18.
3. ***Рапановіч Я.Н.*** Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці. Мн., 1977. – 540 с.



## *S U M M A R Y*

*The article is devoted to the analysis of the surnames of the Vitebsk region inhabitants. The outhor describes the characteristic types of surnames of the West and of the East of the Vitebsk region and explains the causes of their productivity.*